Серыя «УРОКІ: ПРАКТЫЧНЫ ВОПЫТ»

І. М. Мядзведская

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## ПЛАНЫ-КАНСПЕКТЫ ЎРОКАЎ

## 5 клас

**(ІІ паўгоддзе)**

*Дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай і беларускай мовамі навучання*

Мазыр
«Выснова»
2021

# Прадмова

Дапаможнік змяшчае распрацоўкі паўрочных планаў для 5 класа на II паўгоддзе і разлічаны на аказанне метадычнай дапамогі настаўнікам. Размеркаванне матэрыялу прыводзіцца ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, з прыкладным каляндарна-тэматычным планаваннем (2020), а таксама са зместам і структурай вучэбнага дапаможніка (Валочка Г. М., Зелянко В. У., Мартынкевіч С. В., Якуба С. М. Беларуская мова: вучэб. дапам. для 5 класа ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. Мінск, 2019).

У аснову распрацовак планаў-канспектаў пакладзены этнаграфічныя і культуралагічныя тэксты, практыкаванні, заданні, якія садзейнічаюць фарміраванню грамадзянскай ідэнтычнасці на ўроках беларускай мовы. Вывучэнне моўных тэм накіравана на пашырэнне ўяўленняў пяцікласнікаў пра назвы месяцаў, каляндарна-абрадавыя традыцыі, гарады, рэкі, азёры Беларусі, што стварае ўмовы для фарміравання пазнавальных уяўленняў навучэнцаў і павышэння цікавасці да беларускай мовы.

Будова ўрокаў, прыблізныя адказы на пытанні, а таксама разнастайныя фізкультхвілінкі пададзены падрабязна. Вялікая ўвага ўдзяляецца развіццю маўлення вучняў.

Дапаможнік разлічаны на творчае выкарыстанне. Настаўнік можа ўносіць карэктывы з улікам магчымасцей, узроўню падрыхтаванасці класа, а таксама індывідуальных асаблівасцей кожнага вучня.

## Урок 49

# Гукі беларускай мовы

**Мэты:**

- знаёмства з фанетыкай і арфаэпіяй як раздзеламі навукі аб мове; з паняццем пра гук як адзінку мовы; паглыбленне ведаў пра сістэму гукаў беларускай мовы, іх ролю ў мове як кампанентаў слоў і сродкаў іх адрознення;
- выпрацоўка ўмення чуць, вылучаць гукі, абазначаць іх літарамі;
- фарміраванне грамадзянскай ідэнтычнасці праз пашырэнне ведаў пра каляндарны год і назвы месяцаў.

### *Ход урока*

**I. Арганізацыйны момант**

**II. Уступная гутарка**

— Пачалася новая чвэрць, новы год. А хто з вас ведае значэнне слова **год**? *(Адказы вучняў.)*

— А калі ж пачынаўся год у нашых продкаў? *(Беларусы распачыналі год у розны час: 1 сакавіка — на пачатку вясны, 21 сакавіка — у дзень веснавога сонцастаяння, нават 1 верасня. І толькі ў 1700 г., па загадзе Пятра Вялікага, пачатак года сталі святкаваць 1 студзеня. Менавіта ў гэты дзень адзначаюць Новы год усе еўрапейскія краіны і ў наш час.)*

**III. Актуалізацыя ведаў вучняў**

— Устаўце ў патрэбнай форме слова **год** у выразы, якія запісаны на дошцы, і паспрабуйце іх растлумачыць.

Высакосны... (*<u>год</u> — кожны чацвёрты год, які мае ў лютым не 28, а 29 дзён*).

Навучальны... (*<u>год</u> — час вучэбных заняткаў ад канца адных і да пачатку наступных летніх канікул*).

Новы... (*<u>год</u> — свята, дзень 1 студзеня*).

... ў рады (*<u>гады</u> — вельмі рэдка*).

З ... ў ... (*З <u>году</u> ў <u>год</u> — пастаянна, на працягу некалькіх гадоў.*)

Не па ... (*<u>гадах</u> — неадпаведна ўзросту*).

У ... (*<u>гадах</u> — пажылога ўзросту*).

— З чаго складаецца год? *(З месяцаў.)*

— Пералічыце іх. *(Адказы вучняў.)*

— Рыгор Барадулін у сваім вершы «Год-карагод» не толькі называе месяцы, але і імкнецца іх растлумачыць, падабраць да іх сугучныя словы. Паслухайце верш і адкажыце, чаму месяцы маюць такія назвы.

Год,
Ахвочы да прыгод,
Круціць, кружыць карагод.
Пачынае пералік:
Студзень,
Люты,
Сакавік.
Студзень студзіць
Рунь густую.
Люты злосны,
Ён лютуе.
Сок пускае сакавік —
Да салодкага прывык.
Следам з краскай
Красавік,
І лясун,
І палявік.
Травень-май
Траву лагодзіць.
Чэрвень
З чырванню прыходзіць.
Ліпень
Ліпам цвет прыносіць.
Жнівень жне,
Атаву косіць.
Раіць
Верасень вясёлы:
Хай лятуць на ўзлесак
Пчолы.
Там не зябнуць
Ад расы,
Зацвітаюць верасы.
І кастрычнік не гуляе —
Клопату з ільном хапае.
Разлятаюцца кастрынкі,
Як халодныя іскрынкі.
Лістапад
Надвор'ем мглістым
Высцілае сцежкі
Лістам.
Снежань-лежань
Снег трасе.
Вось вам месяцы
І ўсе.
І нанова
Кожны год
Пачынае карагод.

— Чаму ж месяцы маюць такія назвы? *(Адказы вучняў.)*

— А калі разабраць слова **год** на асобныя часткі — цаглінкі, з чаго ён будзе складацца? *(З гукаў і літар.)*

**IV. Паведамленне тэмы і мэтавызначэнне**

*(Тэма запісана на дошцы.)*

— Давайце разам сфармулюем задачы ўрока:

Успомніць...

Пазнаёміцца...

Навучыцца...

## *Літаратура*


1. Беларуская мова: навучальныя і кантрольныя дыктанты: 5—9 класы : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. — Мінск: Аверсэв, 2012.
2. Беларуская мова: навучальныя і кантрольныя пераказы: 5—9 класы : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. — Мінск: Аверсэв, 2012.
3. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. Ч. 1. / Г. М. Валочка [і інш.]. — Мінск: НІА, 2019.
4. Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. Беларуская мова. Беларуская літаратура. V—IX класы. — Мінск: НІА, 2017.
5. *Хмялеўская, А. У.* Тэматычны кантроль па беларускай мове: 5 клас : рабочы сшытак : дапам. для вучняў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А. У. Хмялеўская. — Мінск: СэрВит, 2011.
6. Этнаграфія Беларусі : энцыкл. / В. Я. Фадзеева ; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. — Мн.: БелСЭ, 1989.

## *Змест*

Прадмова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Урок 49. Гукі беларускай мовы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4
Урок 50. Літара як знак гука . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
Урок 51. Прызначэнне літар ***е***, ***ё***, ***ю***, ***я***, ***і*** . . . . . . . . . . . . . . . 12
Урок 52. Беларускі алфавіт. Назвы літар . . . . . . . . . . . . . . . . 15
Урок 53. Склад . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
Урок 54. Націск . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23
Урок 55. Правілы пераносу слоў (паўтарэнне) . . . . . . . . . . . . 27
Урок 56. Галосныя гукі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
Урок 57. Вымаўленне і правапіс галосных ***о***, ***э***, ***а*** . . . . . . . . . 34
Урок 58. Вымаўленне і правапіс галосных ***о***, ***э***, ***а*** (працяг) . . . . . . . . 38
Урок 59. Вымаўленне і правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я*** . . . . . . . . . 42
Урок 60. Вымаўленне і правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я*** (працяг) . . . . . . . 45
Урок 61. Вымаўленне і правапіс спалучэнняў ***іё*** (***ыё***), ***ія*** (***ыя***), ***іе*** (***ые***)у запазычаных словах . . . . . . . . . . . . . . . 48
Урок 62. Вымаўленне і правапіс спалучэнняў ***іё*** (***ыё***), ***ія*** (***ыя***), ***іе*** (***ые***)у запазычаных словах (працяг) . . . . . . . . . . 52
Урок 63. Зычныя гукі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
Урок 64. Зычныя глухія, звонкія і санорныя. Іх вымаўленне і правапіс . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
Урок 65. Свісцячыя і шыпячыя зычныя. Іх вымаўленне і правапіс . . 63
Урок 66. Цвёрдыя, мяккія і зацвярдзелыя зычныя, іх вымаўленне і правапіс . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Урок 67. Мяккі знак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
Урок 68. Раздзяляльны мяккі знак і апостраф . . . . . . . . . . . . 72
Урок 69. Раздзяляльны мяккі знак і апостраф (працяг) . . . . . . . . . . 75
Урок 70. Зычныя [***д***] — [***дз’***], [***т***] — [***ц’***], іх вымаўленне і правапіс . 78
Урок 71. Зычныя [***д***] — [***дз’***], [***т***] — [***ц’***], іх вымаўленне і правапіс (працяг) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 81
Урок 72. Правапіс ***у***, ***ў*** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83
Урок 73. Правапіс ***у***, ***ў*** (працяг) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 87
Урок 74. Падоўжаныя зычныя, іх вымаўленне і правапіс . . . . . . . . 91
Урок 75. Прыстаўныя зычныя і галосныя, іх правапіс . . . . . . . . . . 94
Урокі 76—77. Кантрольны падрабязны пераказ мастацкага тэксту . 97
Урок 78. Правапіс некаторых спалучэнняў зычных . . . . . . . . . . . 99
Урок 79. Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле . 102
Урок 80. Лексічнае значэнне слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107
Урок 81. Адназначныя і мнагазначныя словы . . . . . . . . . . . . . 110
Урок 82. Адназначныя і мнагазначныя словы (працяг) . . . . . . . . . 113
Урок 83. Прамое і пераноснае значэнне слова . . . . . . . . . . . . . 116

Урок 84. Прамое і пераноснае значэнне слова (працяг) . . . . . . . . . . 121
Урок 85. Сінонімы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123
Урок 86. Антонімы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 126
Урок 87. Амонімы (азнаямленне) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
Урок 88. Агульнаўжывальныя словы і словы абмежаванага ўжытку 133
Урок 89. Агульнаўжывальныя словы і словы абмежаванага ўжытку (працяг) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 136
Урок 90. Устарэлыя словы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 139
Урок 91. Неалагізмы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 142
Урок 92. Запазычаныя словы ў беларускай мове . . . . . . . . . . . . . . . 145
Урок 93. Пераклад з рускай мовы на беларускую вучэбнага тэксту 148
Урок 94. Паняцце пра фразеалагізмы, роля фразеалагізмаў у маўленні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 150
Урокі 95—96. Кантрольны падрабязны пераказ мастацкага тэксту . 152
Урок 97. Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле . 155
Урок 98. Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год . . . . . 160

Літаратура . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 162